УДК 745:7.046

# СПЕЦЫФІКА АДЛЮСТРАВАННЯ МІФАЛАГІЧНЫХ ВОБРАЗАЎ У ТВОРАХ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА

***А. В. Шаціло,*** *старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны праблемам разумення міфалагічных вобразаў, іх аналізу, трактоўцы і асэнсаванага выкарыстання ў творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў межах нацыянальных традыцый. Адзначана, што ў прафесійным мастацтве на першы план выходзіць кампазіцыйны, формаўтваральны прынцып, ад яго пачынаецца развіццё сэнсу твора, а ў творах традыцыйнага народнага мастацтва форма залежыць ад зместу, яе ўтварае семантыка. Таму ў сучаснасці твор часцей за ўсё не ўспрымаецца як сакральны паўтор Свету, яго аналогія, а творца буквальна не суадносіць сябе ні з рэччу, ні з Сусветам, таму ўжыванне і спалучэнні знакаў і сімвалаў адбываюцца адвольна ў залежнасці ад фармальнай кампазіцыйнай схемы твора, яго рытма і пластыкі.

**Ключавыя словы:** міфалагічны вобраз, міф, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, светапогляд, традыцыі, сучаснае мастацтва, выява, знак, сімвал.

# SPECIFICITY OF REPRESENTATION OF MYTHOLOGICAL IMAGES IN WORKS OF DECORATIVE AND APPLIED ART

***A. Shatilo,*** *Senior Lecturer of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article is devoted to the problems of understanding mythological images, their analysis and interpretation and their meaningful use in works of decorative and applied art within national traditions. The author notes that in professional art, the compositional, formative principle comes to the fore and the development of the meaning of the work proceeds from it, and in the works of traditional folk art, the form depends on the content, it is formed by semantics. Therefore, in the present work, most often it is not perceived as a sacred repetition of the world, its analogy, and the creator literally does not relate himself either to the thing or to the Universe, and therefore the use and combination of symbols and symbols occurs arbitrarily depending on the formal compositional scheme of the work, its rhythm and plasticity.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Keywords:** mythological image, myth, arts and crafts, worldview, traditions, contemporary art, image, sign, symbol.

Міфалагічныя вобразы дапамагалі чалавеку замяніць невядомае, таямнічае на нешта, што мае канкрэтнае ўвасабленне і лягчэй успрымаецца чалавечай свядомасцю, чым абстрактныя паняцці. Усеагульнасць распаўсюджвання міфаў у жыцці чалавека абумоўлена сімвалічнай прыродай чалавечай культуры. Так міфалагічныя вобразы дапамагаюць перакладаць незразумелае ў свет звычайнага вопыту, яны злучаюць міфічную рэчаіснасць з рэальнай. Пры гэтым значная ўмоўнасць адносінаў вобраза да таго, што ён абазначае, дасягаецца вялікай ступенню абстракцыі.

Тут паўстае праблема разумення міфалагічных вобразаў, іх аналізу і трактоўцы, а потым іх асэнсаванага выкарыстання ў творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў межах нацыянальных традыцый.

Вызначэнне сувязі міфалагічнага вобраза і яго адлюстравання – задача складаная яшчэ і ў сувязі з тым, што большасць вобразаў валодае шматзначнасцю. Заўсёды можа існаваць іншая трактоўка сэнсу, якая мае гістарычную, рэлігійную, стылістычную залежнасць.

У мастацтве міфалагічны вобраз можа з'яўляцца мадэллю, інакш, агульнымі прынцыпамі трансліравацца на бясконца вялікую колькасць кантэкстаў і ў кожным новым выпадку быць носьбітам рознай выявы. Пры гэтым адзін міфалагічны вобраз можа мець бясконца вялікую колькасць увасабленняў, таму што магчыма бясконца вялікая колькасць кантэкстаў. Менавіта кантэкст з'яўляецца тым асяроддзем, у якім міфалагічны вобраз пачынае працаваць пэўным чынам.

Міфы даюць вельмі шмат магчымасцяў для інтэрпрэтацыі яшчэ і таму, што адлюстроўваюць абстрактныя паняцці, адсюль непазбежна з'яўляецца недакладнасць і шматзначнасць, якія робяць немагчымым існаванне толькі аднаго значэння. Такім чынам, значэнне міфалагічнага вобраза ў межах мастацкага твора можа быць дакладна дэтэрмінаванае (адназначна прадказальнае); імавернае (статыстычна прадказальнае з зададзенай дакладнасцю); выпадковае (відавочна непрадказальнае).

Выкарыстанне магічных знакаў і сімвалаў у спалучэнні з пэўнымі прадметамі той ці іншай формы можна аднесці да палеаліту, XVII–XVI тысячагоддзя да н. э. Ужо там можна вызначыць выявы знакаў, якія сталі пра-вобразамі, пра-формамі некаторых сімвалаў: крыжа, кола і г. д.

Узнікненне, фарміраванне і выкарыстанне міфалагічных вобразаў у народным мастацтве заснавана на адзінстве агульных і прыватных уяўленняў, як вынік узаемадзеяння чалавечай свядомасці і пэўнай рэчаіснасці. Кожны твор народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва мае свой выток у міфалогіі, будуе мадэль Сусвету – як стварэнне Космасу з Хаоса. Іншымі словамі, любы твор народнага дэкаратыўна-прыкладнога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва – гэта сістэма, якая так ці інакш адлюстроўвае прынцып светабудовы, узаемасувязь у ім частак і элементаў.

Неабходнай ўмовай для існавання міфалагічных вобразаў мастацтва з'яўляецца наяўнасць некаторай агульнай сістэмы для апісання Свету – светапогляду. Устойлівасць светапогляду як сістэмы, у сваю чаргу, залежыць ад наяўнасці адзінай структуры светабудовы ў самым шырокім сэнсе, дзе кожны з элементаў займае пэўнае месца, вызначае наяўнасць іншага і такім чынам забяспечвае стабільнасць сістэмы.

Ператварэнне Хаоса ў Космас пачынаецца з пераходу ад нічога да нечага, ад бязладнасці да структуры. Сусветнае дрэва ва ўсіх рэлігійных традыцыях знаходзіцца ў цэнтры, і свет разгортваецца вакол яго як вакол вертыкальнага стрыжня. У біблейскай сімволіцы гэта Дрэва, якое расце пасярод раю, які, у сваю чаргу, з'яўляецца цэнтрам свету.

Сусветнае дрэва як сістэма каардынат і ў якасці асноўнай функцыі існуе для вызначэння месца прадмета ў сістэме – Сусвеце. Крыж, калі ён прадстаўляе сістэму каардынат, суадносіцца з міфалагічным вобразам сусветнага дрэва, а сусветнае дрэва, у сваю чаргу, як агульны сусветаўтваральны прынцып суадносіцца з ўсім існым і творным. Крыж можна разглядаць як кампазіцыйную схему рытмаў, дуальных процістаўленняў, чатырохчасткавых падзелаў. Гарызанталі і вертыкалі пазначаюць іерархію структуры. Галоўная сэнсавая роля тут надаецца вертыкальнай лініі – сусветнай восі. Вертыкальная вось праходзіць праз кожную гарызантальную плоскасць у яе адвольна вызначаным цэнтры, кропке раўнавагі. Сусветнае Дрэва ў язычніцкай рэлігіі аналагічна Дрэву пазнання Дабра і Зла, Дрэву жыцця – у хрысціянстве.

Асновай вобразаў твораў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляюцца міфалагічныя ўяўленні старажытнасці пра склад і існаванне Сусвету і чалавека ў ім. Генезіс узыходзіць да старажытнай культуры і светапогляду, калі чалавек успрымаў свет суцэльна: усё падобна да ўсяго, у вялікім – маленькае і ў малым – вялікае. Такой асновай можа стаць міфалогія ў самым шырокім сэнсе слова, і тады трэба вызначыць яе крыніцы: гэта старажытная (язычніцкая) міфалогія, альбо хрысціянская, альбо міфалагічныя ўяўленні іншых народаў свету, што таксама можа сустракацца ў сучасным мастацтве. Зменлівасць знакаў пры стабільнасці міфалагічных вобразаў, іх трансфармацыі пры шматлікіх трансляцыях, накапленне элементаў сааўтарства – усё гэта прывяло да традыцыйнай, у канчатковым выглядзе калектыўный міфалогіі народнага мастацтва, якая адлюстроўвае светапогляд народа.

Таксама значная ступень абстрактнасці ў перадачы складаных паняццяў урадлівасці, жыцця і смерці ў спалучэнні з устойлівасццю вобразаў і сімвалаў вызначыла іх варыятыўнасць, зменлівасць у працэсе стварэння твора, падобна таму, як змяняецца тэкст пры моўнай перадачы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры даследаванні міфалагічнага ўзроўню расшыфроўка сэнсу пачынаецца з абазначэння той сістэмы ўяўленняў, з якой быў узяты вобраз. Зараз у мастацтве можна вылучыць існаванне знешніх і ўнутраных фактараў выкарыстання пэўных тэм, вобразаў і сюжэтаў. Знешнія – гэта традыцыйнасць пэўных уяўленняў, вобразаў, якія існуюць у сістэме народнай культуры, унутраныя – іх інтэрпрэтацыя ў свядомасці мастака.

Так, прыярытэтнасць у выкарыстанні вобразаў захоўваецца за аўтарскімі сэнсамі, іх значнасцю для пэўнага мастака. Часам адбываецца рэканструкцыя на аснове этнаграфічных, фальклорных, міфалагічных крыніц, дзе зафіксавана інтэрпрэтацыя сэнсаў вобразаў пэўнымі супольнасцямі. Аднак гэта правільна толькі для агульнай сэнсавай сістэмы ў межах пэўнай культуры і можа не адпавядаць некаторым асабістым аўтарскім сэнсам, асабліва гэта тычыцца прафесійнага мастацтва, якое па сваёй сутнасці з'яўляецца ўвасабленнем асобы мастака, а не калектыўных уяўленняў, як у народным мастацтве.

Змены ў выкарыстанні міфалагічных вобразаў, іх формах і значэннях у народным мастацтве адбываюцца павольна. У прафесійным мастацтве змены больш дынамічныя, таму што на іх не накладваюцца абмежаванні традыцыйнасці, сама сістэма твора больш абстрактная, яна менш залежыць ад сэнсу знакаў, а больш – ад кампазіцыйнай будовы твора.

Міфалагічны вобраз з'яўляецца вынікам свядомасці і мыслення, але, ужо аднойчы створаны, валодае аўтаномнасцю і незалежнасцю і трансфармуецца па правілах вобразнай сістэмы. Міфалагічны вобраз заўсёды лёгка прымае формы, спецыфічныя для пэўнага віда мастацтва. У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ён ўвасабляецца ў пэўных матэрыялах, а значыць, стылістычна прыстасоўваюцца менавіта да гэтага віда, што заўсёды нейкім чынам змяняе знешні выгляд, але не яго ўнутраны склад – яго значэнне.

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве міфалагічны вобраз трансфармуецца як у якасці выявы, знака, так і самой кампазіцыйнай структуры твора. Міфалагічны вобраз з'яўляецца ў мастацтве як абазначэнне няўяўнага, абстрактнага, у якасці абагульнення. Потым ён набывае пэўны шэраг візуальных увасабленняў, ад канкрэтных выяў да знакаў і рытмаў. Апошняй стадыяй засваення міфалагічных вобразаў з'яўляецца іх выкарыстанне ў мастацкіх творах. Такім чынам, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва мае асноўны фонд міфалагічных вобразаў, а таксама магчымасць запазычання і асіміляцыі новых па правілах сваёй сістэмы, асаблівасцяў свайго віду мастацтва. Так, міфалагічныя вобразы ў мастацтве могуць існаваць і функцыянаваць незалежна адзін ад аднаго, а могуць аб'ядноўвацца ў сістэмы, структура якой і вызначае кампазіцыйную будову і мастацкі вобраз твора. Калі абстрагіравацца ад значэння знака, можна скласці бясконцую колькасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іх кампазіцыйных спалучэнняў. Калі пры стварэнні кампазіцыі кіравацца сэнсам, значэннем знака, узнікае шэраг сістэмных правілаў іх ужывання і спалучэння. Гэта адлюстроўваецца ў свабодным выкарыстанні сімвалаў у творах сучасных прафесійных мастакоў, у адрозненні ад строгіх значэнняў і магчымасцяў спалучэння ў традыцыйнай творчасці.

Адзначым, што ў прафесійным мастацтве на першы план выходзіць кампазіцыйны, формаўтваральны прынцып і ад яго пачынаецца развіццё сэнсу твора, а ў творах традыцыйнага народнага мастацтва форма залежыць ад зместу, яе ўтварае семантыка. Таму кампазіцыя сімвалаў і знакаў старажытнасці пачынае ўтварацца з іх сэнсу і сэнсу іх спалучэнняў. А ў сучаснасці твор ужо не ўспрымаецца як сакральны паўтор Свету, яго аналогія, творца буквальна не суадносіць сябе ні з рэччу, ні з Сусветам, і таму ўжыванне і спалучэнні знакаў і сімвалаў адбываюцца адвольна ў залежнасці ад фармальнай кампазіцыйнай схемы твора, яго рытма і пластыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ